# АРХІТЭКТУРА ПОЛАЦКА Ў IX-XII СТ.

Сакалова М.В., Туміловіч С.І.
Кафедра гуманітарных дысцыплін
Навуковы кіраўнік: Куракевіч Н.І., к.г.н., дацэнт
e-mail: cora-94@mail.ru

***Анатацыя* - Сёння Полацк з'яўляецца адной з самых буйных крыніц гісторыка-археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі дзякуючы велізарнай колькасці розных помнікаў старажытных часоў.**

***Ключавыя словы:** храмы, дойлідства, манастыры, Сафійскі сабор*

Значнае месца сярод іх займае архітэктура. Трэба сказаць, што старажытныя збудаванні карыстаюцца адметнай увагай не толькі сярод вучоных, але і сярод звычайных людзей. Калі запытаць нават у таго беларуса, хто ніколі не бываў у Полацку, напрыклад, пра полацкую Сафію, ён з задавальненнем адкажа пра яе. Так архітэктурныя збудаванні старажытных часоў (не толькі ў Полацку, але паўсюдна) працягваюць служыць людзям.

Да X стагоддзя усе будынкі і ў Полацку, і наогул на тэрыторыі Старажытнай Русі былі драўляныя. У часы хрышчэння Русі у Кіеў прыязджалі візантыйскія майстры-дойліды, што дапамагалі будаваць храмы і дзядзінцы. Яны прыехалі і ў Полацк. Тады і былі закладзены самыя знакамітыя помнікі тагачаснага дойлідства.

Полацкі Сафійскі сабор быў закладзены ў 40-х гадах XI ст. у часы княжання Усяслава Брачыславіча. Яго будавала адна з чатырох візантыйскіх арцеляў, што наведалі тады Русь. Сабор у канструкцыі меў значныя адрозненні ад сабораў у Кіеве і Ноўгарадзе. Пры пабудове быў зроблены акцэнт на "выцягнутасць увышыню" – прапорцыі Сафіі набліжаюцца да квадрата, калі глядзець зверху (чым яна нагадвае Спас у Чарнігаве). Сабор меў пяць купалаў (па летапісных крыніцах канца XVI ст. — сем; два дадатковыя маглі знаходзіцца ў яго заходняй частцы), з якіх вылучаўся галоўны. Ён узвышаўся ў цэнтры будынка і праз барабан і падпружныя аркі абапіраўся на чатыры масіўныя слупы. Утвораная прастора была падобная да крыжа, а ўвесь храм адпавядаў крыжова-купальнаму тыпу культавага збудавання, канструкцыйныя асаблівасці якога склаліся ў Візантыі і былі запазычаны ўсходнімі славянамі разам з іншымі хрысціянскімі формамі. Паводле археалагічных даследаванняў, у саборы існавалі месцы на хорах для княжацкай сям'і, а таксама памяшканні, дзе знаходзілася княжацкая пахавальня. Сцены храма выкладзены з цэглы (плінфы) у тэхніцы візантыйскай кладкі «са схаваным радам». Аснову яе складала чаргаванне радоў цэглы - адзін супадаў знадворку з плоскасцю сцяны, другі ўтопліваўся на невялікую глыбіню адносна верхняга і ніжняга. Ніша, якая ўтваралася, запаўнялася вапнавым растворам з цагляным крошывам (цамянкай). Такі спосаб кладкі надаваў будынку жывапісны выгляд: на фасадах адна над адной ішлі чырвоныя і ружаватыя палосы.

Акрамя Сафіі, у Полацку ёсць два манастырскія комплексы – Барысаглебскі і Спаса-Прэабражэнскі. Першы быў заснаваны як рэзідэнцыя князёў. Там, паводле даследаванняў, было пабудавана 4 храмы:Вялікі сабор, Барысаглебская і Пятніцкая цэрквы, храм-трыконх, які больш за ўсё нагадваў сербскія і грэчаскія храмы... Аднак, нажаль, з ходам вякоў ад іх засталіся толькі падмуркі. Што датычыцца Спаса-Прэабражэнскага манастыра, ён захаваўся да нашых часоў у практычна некранутым стане (акрамя зруйнаванай пахавальні). Усе гэтыя будынкі былі пабудаваны ў характэрным візантыйскім стылі. Аднак трэба заўважыць, што сепаратысцкія настроі Полацка ў складзе Кіеўскай Русі паўплывалі і на архітэктуру. Менавіта таму у вышэйзазначаных пабудовах прагледжваюцца адрозненні ад традыцыйнага стылю, прынятага ў Кіеве. І недалёк быў той час, калі архітэктурная "думка" полацкіх дойлідаў пацякла па сваім напрамку…

Як мы бачым, цэрквы і манастыры зараз з'яўляюцца асноўнымі помнікамі полацкай архітэктуры. Аднак нельга не прыгадаць пра шншыя, больш позція збудаванні: пра абарончы вал з замкамі, пра пабудаваны ў XVIII ст. комплекс іезуіцкага калегіума, пра шматлікія іншыя цэрквы і касцёлы.

Велізарны, прычым не толькі з пункту гледжання гісторыі. Архітэктура і наогул культура паказвае стан душы людзей, што яе стваралі. А тое, што "ставілася на вякі", будавалася не дзеля таго, каб застацца забытым нашчадкамі. Гісторыя вучыць нас памылкам мінулых гадоў, каб мы не паўтаралі іх зараз, а вывучэнне культуры – лепшаму разуменню Сусвету, адзін аднаго, самога сябе.

У наш век матэрыялізму, панавання грошай і інфармацыйных тэхналогій мы павінны гэта памятаць – і імкнуцца дастойна працягнуць ствараць прыгожае. Бо толькі так гэты працяг адрадзіцца ў не менш прыгожы пачатак.

[1] Штыхов Г.В. Древнеполоцкое каменное зодчество // Белорусские древности. – Мн., 1967.
[2] Ткачоў. Новае пра Сафійскі сабор // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1972. № 2.
[3] Памятники монументального зодчества Белоруссии XI-XVII вв. – Мн., 1988.
[4] Хозеров И.М. Белорусское и смоленское зодчество XI-XIII вв – Мн., 1994.